Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №5(68), 2011

**ФИЛОСОФИЯ**

*УДК 13 : 316. 647. 5 (476)*

# Праблема рэлігійнай талерантнасці ў сучаснай Беларусі

В. А. АДЗІНОЧАНКА

У артыкуле разглядаецца праблема рэлігійнай талерантнасці. Сцвярджаецца, што дасягненне талерантных узаемаадносін паміж людзьмі не з'яўляецца толькі маральным патрабаваннем, але павінна абапірацца на існуючую ў краіне культурную традыцыю, а таксама прававыя нормы. Аналізуюцца пытанні наладжвання міжканфесійнага дыялогу на Беларусі. Прыводзяцца статыстычныя дадзеныя і вынікі сацыялагічных даследаванняў, якія характарызуюць сучасную рэлігійную сітуацыю ў краіне. Сцвярждаецца, што ва ўмовах поліканфесійнай Беларусі рэлігійная талерантнасць з'яўляецца неабходнай ўмовай захавання цэласнасці грамадства і яго развіцця.
**Ключавыя словы:** дзяржаўны атэізм, дэкларатыўная рэлігійнасць, пераходная сітуацыя, свабода сумлення, талерантнасць.

The article deals with the problem of religious tolerance. It has been stated that tolerant relations between people are not only moral requirement, but they should base both on the cultural tradition, existing in the society, and on law norms. The problems of the inter-confession dialogue development have been analyzed. Statistical data and the results of sociological research have been given, that characterize modern religious situation in the country. It has been stated that in multi-confession Belarus religious tolerance is a necessary condition of the state integrity preservation and its development.
**Keywords:** state atheism, declarative religiousness, transition situation, freedom of consciousness, tolerance.

Спачатку скажам аб шматаспектнасці пазначанай праблемы. Зараз на Беларусі адбываюцца істотныя змены ў розных галінах жыцця, у тым ліку і ў рэлігіі. Таму праблема талерантнасці закранае псіхалагічныя, сацыяльныя, юрыдычныя і іншыя моманты. Мы пастараемся выкласці яе так, каб дасягнуць некаторай паўнаты, магчымай у межах артыкула, і тым самым даць уяўленне аб ёй як аб нейкай цэласнасці.

Нельга не адзначыць актуальнасці (ад лац. *actualis – дзейсны*) той праблемы, якая абмяркоўваецца. Мы можам выявіць два аспекты разважанняў аб рэлігійнай талерантнасці, абумоўленыя характарам той сітуацыі, у якой зараз знаходзіцца наша грамадства, а таксама тэндэнцыямі яе развіцця.

Першы – гэта канстатацыя росту колькасці рэлігійных арганізацый. За перыяд з 1988 года яна павялічылася больш як у 4 разы (з 768 да 3162). Для ілюстрацыі рэлігійнага становішча ў краіне прывядзём статыстычныя дадзеныя па колькасці рэлігійных суполак на 1 студзеня 2011 г.:

| Найменне канфесіі | Усяго па рэспубліцы |
|---|---|
| Праваслаўная царква | 1545 |
| Стараверская царква | 32 |
| Рымска-каталіцкая царква | 475 |
| Католікі лацінскага абраду | 1 |
| Грэка-каталіцкая царква | 15 |
| Рэфармацкая царква | 1 |
| Лютэранская царква | 27 |
| Евангельскія хрысціяне-баптысты | 275 |
| Іаганская царква | 1 |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | |
|---|---|
| Новаапостальская царква | 21 |
| Прэсвітэрыянская царква | 1 |
| Хрысціяне веры евангельскай | 505 |
| Хрысціяне поўнага Евангелля | 55 |
| Хрысціяне веры апостальскай | 9 |
| Царква Хрыстова | 5 |
| Месіянскія суполкі | 2 |
| Адвентысты сёмага дня | 72 |
| Сведкі Іеговы | 27 |
| Мармоны | 4 |
| Іудзейская рэлігія | 35 |
| Прагрэсіўны іудаізм | 17 |
| Мусульманская рэлігія | 24 |
| Бахаі | 5 |
| Крышнаіты | 6 |
| Армянская апостальская царква | 1 |
| **Усяго** | **3162** |

Для нашых разважанняў трэба падкрэсліць, што для Беларусі характэрна поліканфесійнасць. Самай вялікай канфесіяй, калі судзіць па колькасці зарэгістраваных суполак, з'яўляецца праваслаўе (1545 суполкі), потым ідуць хрысціяне веры евангельскай (505) і рыма-каталікі (475). Але, на наш погляд, колькасць зарэгістраваных суполак той ці іншай канфесіі не з'яўляецца відавочным паказчыкам той ролі, якую яна адыгрывае ў сучаснай рэлігійнай сітуацыі на Беларусі. Пытанне аб колькасці прыхільнікаў той ці іншай канфесіі на Беларусі зараз з'яўляецца даволі спрэчным. Афіцыйна лічыцца, што прыкладна 50% насельніцтва краіны – веруючыя, з іх прыкладна 80% – праваслаўныя, 10% – каталікі і 2% – пратэстанты. На наш погляд, тут ідзе супастаўленне розных паказчыкаў, бо падлік адбываецца на падставе самавызначэння чалавека, таго, да якой веры ён сам сябе адносіць. У праваслаўі і пратэстанцтве гэтае аднясенне мае розны сэнс. Як правіла, аднясенне да праваслаўя мае характар не рэлігійнай, а культурнай ідэнтыфікацыі. Чалавек лічыць сябе праваслаўным таму, што ў дзяцінстве быў хрышчоны ў праваслаўнай царкве або ў сілу ўяўленняў, што праваслаўе – "усходнеславянская рэлігія". Калі ж чалавек заяўляе аб сваёй прыналежнасці да пратэстанцтва, у гэта ўкладваецца зусім іншы сэнс. Як правіла, гэта азначае, што ён рэгулярна наведвае суполку, прымае ўдзел у яе жыцці, вывучае Біблію і суадносіць яе палажэнні са сваімі паводзінамі. Таму, на наш погляд, трэба праводзіць далейшыя даследаванні для аналізу рэальнай рэлігійнай сітуацыі на Беларусі, пра што, дарэчы, пішуць многія даследчыкі. Таксама пры абмеркаванні праблемы талерантнасці неабходна ўлічваць, так бы мовіць, "якаснае адрозненне" паводзін прадстаўнікоў розных канфесій. Напрыклад, у пратэстанцтве ёсць тры асноўныя палажэнні веравучэння, распрацаваныя яшчэ Марцінам Лютэрам у яго палеміцы з каталіцтвам: 1) выратаванне адбываецца толькі праз веру; 2) Біблія з'яўляецца адзінай крыніцай веравучэння; 3) усе веруючыя з'яўляюцца святарамі. Гэтыя палажэнні абумовілі спецыфіку паводзін пратэстантаў у іх стаўленні да людзей іншых поглядаў: 1) яўна выражаная ўпэўненасць у сваіх перакананнях (або імкненне прадэманстраваць яе); 2) імкненне суаднесці свае выказванні са Словам Божым – Бібліяй, аўтарытэт якой для кожнага хрысціяніна з'яўляецца безумоўным; 3) імкненне да місіянерскай дзейнасці. Нават калі яны не займаюцца ёй спецыяльна, пратэстанты актыўна ўступаюць у дыскусіі, распавядаюць аб сваёй веры і імкнуцца далучыць да яе. Усё гэта ўплывае на наладжванне з імі талерантных узаемаадносін. Апрача таго, самі паводзіны пратэстантаў прадугледжваюць магчымасць абмеркавання і свабоднай дыскусіі наконт палажэнняў хрысціянскага веравучэння, а гэта значыць – прастору рэлігійнай талерантнасці. Трэба ўлічваць, што большасць тых пратэстанцкіх кірункаў, якія зараз распаўсюджаны на Беларусі, сфарміраваліся ў ЗША на падставе існуючых там прынцыпаў свабоды веравызнання і рэлігійнай талерантнасці. Таксама гэтыя прынцыпы характэрны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і для Еўропы, менавіта тут яны прашлі доўгую і цяжкую гісторыю фарміравання. І таму ўваходжанне Беларусі ў прастору еўрапейскай культуры прадугледжвае ажыццяўленне прынцыпаў рэлігійнай талерантнасці.

Пераходная сітуацыя, у якой зараз знаходзіцца наша краіна, абумоўлена пачатай у СССР у сярэдзіне 80-х гадоў мінулага стагоддзя так званай перабудовай, абвяшчэннем у 1991 годзе дзяржаўнай незалежнасці Беларусі і далейшым развіццём нашай краіны. Адбыліся істотныя змены ў стаўленні да рэлігіі: адмаўленне ад палітыкі дзяржаўнага атэізму і наладжванне дыялогу з рэлігійнымі арганізацыямі.

У сувязі з гэтым адзначым, што нам зараз трэба выпрацоўваць вопыт талерантнасці, магчымасці бесканфліктнага суіснавання людзей з самымі рознымі поглядамі і перакананнямі. Бо савецкае грамадства не было талерантным прынцыпова, у ім абвяшчаўся тэзіс, што немагчыма "мірнае існаванне" ў ідэалагічнай сферы. У галіне рэлігіі ў СССР паслядоўна праводзілася атэістычная палітыка. Фармальна абвяшчалася свабода сумлення, але яна мела чыста дэкларатыўны характар і на самой справе жорстка падаўлялася. Улады разглядалі рэлігію не проста як "перажытак мінулага" і "опіум народа", але і як "адзіную легальна існуючую ў СССР антыкамуністычную ідэалогію", з якой неабходна было змагацца.

У апошні час у нашым грамадстве сітуацыя паступова мяняецца. Адбыліся не толькі змены ў заканадаўстве, але і ў рэальным стаўленні ўладаў да веруючых. Зараз людзі могуць адкрыта заявіць аб сваіх рэлігійных поглядах і пры гэтым не баяцца рэпрэсій з боку ўлад. Змяніліся і адносіны да веруючых у грамадстве, на іх ужо не глядзяць як на людзей "несучасных", "адсталых" і тым больш "фанатыкаў".

Трэба адзначыць, што пералом у стаўленні да рэлігіі ў часы перабудовы меў перш за ўсё палітычныя прычыны. Шмат якія аўтары звязваюць яго з тым, што страціла сваё жыццёвае значэнне камуністычная ідэалогія і на яе месца прыйшла рэлігійная.

Згодна з сацыялагічнымі апытаннямі, напярэдадні распаду Савецкага Саюза да ліку няверуючых адносіла сябе каля 65% насельніцтва рэспублікі, а ў 1998 – 25,4%, гэта значыць, амаль у 2,5 разы менш. За гэты ж час амаль удвая вырасла катэгорыя тых, хто лічыць сябе веруючым – з 22 да 37,5%. Аднак гэтыя лічбы не павінны ўводзіць у зман – як паказваюць сацыялагічныя даследаванні, рэлігійнасць жыхароў Беларусі мае пераважна дэкларатыўны характар: веруючымі называюць сябе прыкладна 50% насельніцтва, у той час рэгулярна наведваюць храмы і выконваюць прадпісанні сваёй рэлігіі не больш 7% насельніцтва. Аднак модным зрабілася дэманстраваць сваю рэлігійнасць. Асабліва распаўсюджанай гэтая мода была ў 90-я гады мінулага стагоддзя, калі на хвалі перабудовы імкнуліся адмовіцца ад усяго савецкага і звярнуцца да іншых каштоўнасцей. У рэлігійнай сферы зараз пануе неакрэсленая духоўнасць, лічыцца, што трэба ў нешта верыць. Большасць беларусаў атаясамлівае сябе з праваслаўем, але размова ў дадзеным выпадку ідзе не аб рэлігійнай, а аб культурнай ідэнтыфікацыі – чалавек заяўляе аб сваёй прыналежнасці да акрэсленай традыцыі. За гады Савецкай улады ў большасці людзей было страчана само разуменне таго, што такое рэлігія. Яна зводзілася, па-першае, да выканання традыцыйных абрадаў (як прыклад: амаль 100% насельніцтва Беларусі і пры камуністах святкавала Пасху) і, па-другое, да сродку суцяшэння чалавека ў яго бедах. Вельмі часта рэакцыяй людзей на змены пачатку 90-х гадоў, якія разбурылі звыклы лад іх жыцця, быў зварот да рэлігіі.

Як паказалі сацыялагічныя даследаванні, прыкладна палова насельніцтва верыць у варажбу, сурокі і г.д., прычым у гэта ж верыць і больш паловы людзей, якія лічаць сябе веруючымі. Цікава, што ў гэтыя і падобныя ім рэчы вераць і значная частка людзей, якія лічаць сябе няверуючымі. Да гэтага дадаюцца рэшткі вельмі моцнай язычніцкай традыцыі, якая існавала на Беларусі. Напрыклад, значная частка насельніцтва зараз святкуе праваслаўную Радуніцу. Але па тым, як гэта робіцца, можна зрабіць вывад, што гэта – былыя Вясеннія Дзяды ("дзядамі" на Беларусі называюць духаў памёрлых продкаў). Людзі ідуць на могілкі, ядуць там і п'юць і частку ежы і пітва пакідаюць на магілах. Гэта чыста язычніцкі звычай кармлення "дзядоў". Яго рэлігійны сэнс большасць людей зараз не асэнсоўвае, гэта ўспрымаецца як традыцыя. Але, безумоўна, што такія дзеянні знаходзяцца па-за межамі хрысціянства.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Шмат якія даследчыкі пішуць аб “эфекцеківача” ў развіцці стаўлення да рэлігіі ў постсавецкіх краінах – ад дэкларатыўнага масавага атэізму да дэкларатыўнай рэлігійнасці. Гэта ж назіраецца і ў разуменні талерантнасці, яна разглядаецца як, безумоўна, станоўчая якасць чалавека і грамадства. І вельмі часта гэтыя разважанні маюць чыста абстрактны характар. За імі не стаяць ні асэнсаванне наяўнай рэлігійнай сітуацыі ў краіне, ні рэальныя паводзіны тых, хто разважае. Больш таго, мы можам казаць аб з’яўленні ў апошнія часы “рэпрэсіўнай талерантнасці” (выраз Г. Маркузе), калі любая акрэсленасць поглядаў і палеміка разглядаюцца як праява неталерантнасці. Для нас гэта абцяжарваецца яшчэ і тым, што, калі кажуць аб талерантнасці, вельмі часта выкарыстоўваюцца схемы разважанняў, распрацаваныя зусім у іншых культурных умовах без якой-небудзь спробы суаднесці іх з рэальнай сітуацыяй ні той культуры, з якой яны былі запазычаны, ні беларускай. І таму гэтыя разважанні – як іншароднае цела ў нашай грамадскай свядомасці, яны дэскрэдытуюць саму ідэю талерантнасці, бо з-за сваёй дэкларатыўнасці не даюць магчымасці наладзіць дыялог паміж прыхільнікамі розных поглядаў і заводзяць у тупік. І таму вельмі важным для нас з’яўляецца абмеркаванне, якое зараз адбываецца ў Еўропе, вынікаў палітыкі мультыкультуралізму, накіраванай на захаванне ў асобнай краіне і свеце ў цэлым культурных адрозненняў. У апошнія часы ў выступленнях кіраўнікоў вядучых еўрапейскіх дзяржаў было адзначана, што гэтая палітыка не дала плёну і раз’ядноўвае грамадства. Зараз у Еўропе назіраецца імкненне перайсці ад абстрактных разважанняў да ўліку рэальнай культурнай традыцыі той ці іншай краіны.

Усё тое, што сказана вышэй, не адмяняе самой неабходнасці развіцця талерантнасці на Беларусі, але патрабуе перавесці дыскусію на глебу нашай сацыяльнай і культурнай рэчаіснасці. Гэта – другі аспект разважанняў аб праблеме рэлігійнай талерантнасці ў сучаснай Беларусі, на які мы хацелі б звярнуць увагу.

У псіхалагічным плане “талерантнасць “ і “нецярпімасць” азначаюць супрацьлеглыя ўстаноўкі на ўспрыманне “іншасці” іншага. Безумоўна, талерантнасць з’яўляецца неабходнай умовай існавання сучаснага грамадства, для якога характэрны плюралізм поглядаў і паводзін.

Але пры разважанні аб талерантнасці, у прыватнасці, аб талерантнасці ў нашай краіне, мы хацелі б зрабіць націск не на маралізаванне (“трэба быць талерантнымі”), а на праблематызацыю (грэч. problema – *задача, цяжкасць, перашкода*), каб чалавек канкрэтызаваў для сябе, што такое талерантнасць, звязаў яе са сваім жыццём і тым самым адчуў, якія намаганні яму трэба зрабіць, каб быць талерантным. Бо гэтыя намаганні неабходныя. Не так лёгка суіснаваць побач з чалавекам, чые погляды і ўчынкі выклікаюць пачуццё непрымання. Фармальным спосабам паводзін, пры дапамозе якога можна супрацьстаяць неталерантнасці, з’яўляецца элементарная ветлівасць – здольнасць з павагай і тактоўнасцю узаемадзейнічаць з людзьмі, гатоўнасць успрыняць іх меркаванні і выслухаць супрацьлеглыя пункты погляду. Але ветлівасць мае, па-першае, свае падставы і, па-другое, свае межы. І менавіта таму талерантнасць з’яўляецца праблематычнай, бо для чалавека характэрна настойваць на сваіх перакананнях і лічыць іх правільнымі (інакш ён бы іх не прытрымліваўся). Апрача таго, у сваіх паводзінах людзі заўсёды ствараюць адзін аднаму праблемы, і кожны, як правіла, лічыць, што яны створаны іншымі, а не ім.

Але ўзаемадзеянне паміж прыхільнікамі розных рэлігійных (або антырэлігійных) поглядаў – вельмі праблематычная сфера, у якой найбольш верагодна праяўленне нецярпімасці. Рэлігія грунтуецца на веры ў звышнатуральнае – тое, што мае для чалавека найбольшую каштоўнасць і на што ён абапіраецца ў сваім жыцці. Таму разыходжанні паміж прадстаўнікамі розных рэлігійных поглядаў маюць для іх прынцыповы характар. Гісторыя сведчыць, што праявы неталерантнасці часцей за ўсё адбываліся менавіта на рэлігійнай глебе, напрыклад, такое жахлівае пакаранне, як спальванне, ужывалася пераважна да тых, каго лічылі ерэтыкамі.

Зараз у нашай грамадскай свядомасці талерантнасці надаецца статус адной з асноўных рыс нацыянальнага характару. Пішуць аб “талерантным беларусе” і тлумачаць гэта тым, што Беларусь доўгі час была паміж Усходам і Захадам, таму тут суіснавалі прыхільнікі розных поглядаў. Шмат у чым гэта так. Трэба падкрэсліць, што Беларусь – гэта традыцыйна поліканфесійная дзяржава, на яе тэрыторыі мірна жылі прадстаўнікі самых розных рэлігій. У нас не было сур’ёзных сутыкненняў, а таксама праследаванняў на рэлігійнай глебе. Для беларусаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

была характэрна верацярпімасць. У Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 года было запісана: «А таксама прывілеем, прысягаю нашай вырашана мір паміж рознымі рэлігіямі бярэгчы... А ў сувязі з тым, што ў Рэчы Паспалітай існуе не малая розніца ў адносінах веры хрысціянскай, папярэджваючы тое, каб па гэтай прычыне паміж людзьмі сутыкненні якія-небудзь шкодныя не пачаліся, якія ў іншых каралеўствах ясна бачым, абяцаем тое сабе сумесна за нас і за нашчадкаў нашых на вечныя часы пад абавязкам прысягі, пад вераю, гонарам і сумленнем нашым, што мы, якія з'яўляемся рознымі ў веры, мір паміж сабой захоўваць, а ў сувязі з рознасцю ў веры і з адрозненнем у цэрквах крыві не праліваць…» [4, с. 112–113].

Але зараз, і гэта адзначаюць шмат якія аўтары, беларусам трэба выходзіць са стану "памежнасці", асэнсоўваць сваю культурную і гістарычную спецыфіку і менавіта на гэтай глебе будаваць, у прыватнасці, талерантныя узаемаадносіны паміж рознымі канфесіямі.

У перакладзе *талерантнасць* азначае *цярпімасць* (ад лац. *tolerantia – цярпенне*). Яе вызначаюць як цярпімасць да іншых поглядаў, вераванняў, паводзін. Але, на нашу думку, пры пабудове ўзаемаадносін паміж людзьмі з рознымі поглядамі не зусім адэкватным з'яўляецца націск менавіта на пачуццё цярпімасці. Неабходна падстава, абапіраючыся на якую, можна знаходзіцца побач з тымі, з кім нязгодны.

Талерантнасць можа разумецца, па-першае, фармальна, як вынік абыякавасці да сутнасці іншых поглядаў, якая праяўляецца у рэлятывізме: лічыцца, што любыя погляды з'яўляюцца суб'ектыўнымі і менавіта таму раўнапраўнымі. Але трэба сказаць, што гэтая пазіцыя з'яўляецца сведчаннем нежадання абмяркоўваць існуючыя праблемы, а таксама імкнення прадэманстраваць "шырыню сваіх поглядаў". Як правіла, людзі з такой устаноўкай, калі яны сутыкаюцца з выказваннямі і паводзінамі, якія закранаюць іх інтарэсы, дэманструюць вельмі моцную нецярпімасць. Па-другое, талерантнасць можа разумецца змястоўна. Для талерантнага ў гэтым сэнсе чалавека і грамадства характэрна ўпэўненасць у правільнасці сваіх поглядаў, у сукупнасць якіх уваходзіць таксама перакананне, што трэба быць цярпімымі да іншых поглядаў і паводзін. Такая пазіцыя не выключае плюралізму думак, але таксама сцвярджаецца, што любыя ідэі павінны абмяркоўвацца і ацэньвацца. Але тады некаторыя погляды і спосабы паводзін могуць быць непрынятымі.

Як прыклад першага тыпу талерантнасці мы можам прывесці пазіцыю так званых нетрадыцыйных рэлігій. Гэта рэлігіі, якія ўзніклі у ХХ стагоддзі ў Заходняй Еўропе і Паўночнай Амерыцы і ў якіх робіцца націск на тое, што "традыцыйныя рэлігіі" (хрысціянства, іслам, будызм і інш.) былі абмежаванымі ў сваіх веравучэннях і не адпавядаюць сучасным умовам, а трэба мець погляды, якія аб'ядноўваюць у сабе ўсё тое лепшае, што напрацавала чалавецтва. Знешне прыхільнікі гэтых рэлігій дэманструюць поўную павагу да іншых рэлігійных поглядаў і толькі прапануюць адмовіцца ад "абмежаванасці", але аснова іх веравучэння мае вельмі канкрэтны характар (як правіла, гэта запазычаная з індуізму вучэнне аб аватарах – розных праявах Боства). Як толькі пачынаеш на гэта ўказваць і не згаджацца з імі, яны дэманструюць надзвычай моцную ступень неталерантнасці. Тлумачыцца гэта тым, што ў гэтых рэлігіях адсутнічае распрацаванае вучэнне аб стаўленні да людей, якія не прымаюць тваe погляды.

Нам трэба падкрэсліць, што тое, што мы называем талерантнасцю, – гэта прадукт менавіта еўрапейскай культуры, і выпрацавана яна шмат ў чым на падставе хрысціянства.

Мы можам сказаць пра некаторыя палажэнні хрысціянства, абапіраючыся на якія, фарміруецца талерантнасць. Першае – гэта ідэя любві да іншага чалавека як асноўная якасць хрысціяніна: "Вы чулі, што сказана: любі блізкага твайго і ненавідзь ворага твайго. А Я кажу вам: любіце ворагаў вашых, слаўце тых, хто праклінае вас, рабіце дабро тым, хто ненавідзіць вас і маліцеся за тых, хто крыўдзіць вас і пераследуе вас" (Мц. 5, 43–44). Другое – гэта асуджэнне фарызейства (пад фарызеямі разумеюцца людзі, якія лічылі сябе "праведнымі" і на гэтай падставе асуджалі іншых): "Двое людзей увайшлі ў храм памаліцца: адзін фарызей, а другі мытнік. Фарызей, стоячы, гэтак маліўся ў сабе: "Божа, дзякую табе, што я не такі, як другія людзі, рабаўнікі, крыўдзіцелі, чужаложцы, або як гэты мытнік. Пашчуся два разы ў тыдзень; даю дзесяціну з усяго, што прыдбаю. Мытнік жа, стаўшы здалёк, не адважыўся нават вачэй падняць на неба; але, б'ючы сябе ў грудзі, казаў: "Божа, будзь міласцівы да мяне, грэшніка!". Кажу вам, што гэты пайшоў у дом свой апраўданым больш, чым той" (Лк. 18, 10–14).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Шмат якія аўтары пішуць, што пры ўзаемадзеянні паміж рознымі рэлігійнымі накірункамі трэба рабіць націск не на кансэнсус, а на кампраміс. Бо веравучэнне розных рэлігійных накірункаў мае несумяшчальныя паміж сабой палажэнні, напрыклад, у каталікаў і пратэстантаў, гэта стаўленне да Дзевы Марыі і святых. Але і кампраміс, на наш погляд, з'яўляецца недастатковай падставай для талерантнасці. Больш трывалым будзе паглыбленне ў сваю веру і менавіта адсюль успрыманне веруючых, якія належаць да іншых рэлігій. Як прыклад, мы прывядзём пазіцыю такога арыгінальнага і глыбокага рускага мысліўцы, як Канстанцін Лявонцьеў (1831–1891). Ён абвяшчаў сябе паслядоўна праваслаўным чалавекам і сваё жыццё закончыў у манастыры. Але лічыў вельмі карысным для праваслаўных вопыт каталікаў, якія «людзі моцныя, перакананыя, упартыя, *якія і нам могуць служыць добрым прыкладам*» [3, с. 311]. Можна прывесці і шмат іншых выказванняў (праваслаўных, каталікаў, пратэстантаў, мусульман), у якіх дэманструецца павага да прыхільнікаў іншых рэлігій за іх адданасць сваёй веры.

Трэба таксама адзначыць, што хаця рэлігійная сітуацыя ў сучаснай Беларусі мае свае праблемы, але ў цэлым для яе характэрна мірнае суіснаванне прадстаўнікоў розных канфесій, а таксама наяўнасць міжрэлігійнага дыялогу. Яго асноўным ініцыятарам зараз з'яўляецца праваслаўная царква. На ўзроўні рэспубліканскага кіраўніцтва наладжаны вельмі добрыя ўзаемаадносіны паміж праваслаўнымі і каталікамі, ідзе ўзаемадзеянне з евангельскімі хрысціянамі-баптыстамі, праведзены вельмі прадстаўнічыя канферэнцыі па пытаннях дыялогу з мусульманамі і іудзеямі.

Але, на наш погляд, талерантнасць у сучасным грамадстве Беларусі павінна будавацца не на рэлігійнай аснове, бо рэлігія для гэтага не прызначана. Павінна быць свецкая аснова, а канкрэтна, дакладна распрацаваная прававая база, якая б забяспечвала ў краіне права на розныя погляды, больш канкрэтна – на свабоду сумлення. Заканадаўства Беларусі зараз гэта забяспечвае. У артыкуле 16 Канстытуцыі напісана: "Рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам". Аб гэтым жа кажа закон "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях": "Рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам. Ідэалогія рэлігійных арганізацый не можа ўстанаўлівацца ў якасці абавязковай для грамадзян" (Арт. 6), "Грамадзяне роўныя перад законам незалежна ад іх стаўлення да рэлігіі. У афіцыйных дакументах стаўленне грамадзяніна да рэлігіі не ўказваецца, апрача выпадкаў, калі гэтага жадае сам грамадзянін. Перашкода ажыццяўленню правоў на свабоду сумлення і веравызнання, а таксама ўстанаўленне якіх-небудзь пераваг або абмежаванняў правоў грамадзян у залежнасці ад іх стаўлення да рэлігіі не дапускаецца і праследуецца па закону" (Арт. 7).

У заключэнне адзначым наступнае. Талерантнасць – гэта жыццёвая пазіцыя (як індывіда, так і грамадства), і яна павінна быць выпрацавана на нейкіх падставах. Яна не самакаштоўная, і яе трэба суадносіць з іншымі патрабаваннямі, напрыклад, з правам абмяркоўваць любыя рэлігійныя або палітычныя погляды і не прымаць іх (быць да іх нецярпімымі). Рэлігійная талерантнасць не можа існаваць проста як патрабаванне, яна павінна мець "анталагічны базіс", абапірацца на прававыя нормы, культурную традыцыю і рэальныя ўзаемаадносіны паміж рознымі канфесіямі ў грамадстве.

Трэба адзначыць, што талерантнасць з'яўляецца спосабам пераадолення нецярпімасці і варожасці паміж прыхільнікамі розных поглядаў і паводзін. Яна ўзнікае ў сітуацыі дыялогу, які павінен ажыццяўляцца. Яго аснова – імкненне высветліць пункт погляду іншага чалавека, застаючыся пры гэтым пры сваіх перакананнях, але суадносячы іх з перакананнямі іншых людзей. У сферы ўзаемадзеяння паміж рознымі канфесіямі ёсць праблемы з наладжваннем дыялогу. Бо прадстаўнікі некаторых рэлігійных арганізацый проста прапаведуюць свой пункт погляду, не жадаючы слухаць іншых.

Таксама мы звяртаем увагу на тое, што, кажучы аб узаемадзеянні паміж канфесіямі, трэба выходзіць менавіта са спецыфікі беларускай сітуацыі. Бо ёсць небяспека выкарыстання схем разважання, створаных на падставе аналізу сітуацыі ў іншых краінах. Напрыклад, адной з актуальных тэмаў разважанняў зараз з'яўляецца праблема "ісламскага тэрарызму". Але трэба падкрэсліць, што само яе ўзнікненне абумоўлена падзеямі, якія адбываюцца за тысячы кіламетраў ад Беларусі і ніякага дачынення да нас не маюць. Мусульмане з'явіліся на нашых

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

землях у пачатку XIV стагоддзя, мірна тут жылі, дэманстравалі патрыятычную пазіцыю і ўнеслі свой уклад у развіццё беларускай культуры. Цяперашняе кіраўніцтва аб'яднання мусульман неаднаразова падкрэслівала сваю павагу да іншых рэлігій і непрыманне гвалтоўных паводзін ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі розных поглядаў.

Разважаючы аб рэлігійнай талерантнасці і міжканфесійным дыялогу, трэба памятаць, што большасць тых рэлігій, якія зараз ёсць на нашых землях, дзейнічаюць тут даўно і не з'яўляюцца нечым іншародным для нашай культуры і грамадства. Наладжванне талерантных узаемаадносін паміж прыхільнікамі розных канфесій, якія існуюць зараз на Беларусі, з'яўляецца адной з асноў стабільнасці краіны і яе далейшага развіцця.

**Літаратура**

1 Закон "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях": закон Рэспублікі Беларусь. – Мінск: Беларусь, 1996. – 23 с.

2 Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі і дапаўненнямі). – Мінск: Беларусь, 2004. – 95 с.

3 Леонтьев, К.Н. Православие и католицизм в Польше / К.Н. Леонтьев // Записки отшельника / Сост., вступ. ст., примеч. В. Кочеткова. – М.: Русская книга, 1992. – С. 305–318.

4 Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 17.01.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ